Урок беларускай літаратуры ў 8 класе (настаўнік Зэкава М.А.)

**ТЭМА: Кандрат Крапіва - байкапісец**

**МЭТЫ:** стварыць умовы для асэнсавання вучнямі творчай спадчыны Крапівы-байкапісца; развіваць у вучняў уменні і навыкі выразнага чытання, аналізу алегарычнага твора, звязнага маўлення; выхоўваць станоўчыя маральныя якасці асобы вучняў.

**Абсталяванне**: мультымедыйная прэзентацыя, партрэты пісьменнікаў, выстава кніг. К.Крапівы

**Эпіграф**:

Ён – майстра. Больш таго, ён – чараўнік, якому прырода адкрыла запаветнае слова, здольнае тварыць цуды: рабіць волатам кволага, вяртаць упэўненасць зняверанаму, адкрываць вочы на праўду і крыўду. (С. Лаўшук)

**Ход урока**

**1. Матывацыйна-арганізацыйны этап.**

**Уступнае слова настаўніка.** Добры дзень, паважаныя! Усім здавён вядома, што смех працягвае жыццё. Таму не саромцеся, усміхніцеся адзін аднаму і пачнём наш урок.

Хто з вас у дзяцінстве не баяўся крапівы? Вядома ж, надта страшнай здавалася тая расліна: кранеш – імгненна балюча пякуць скуру чырвона-белыя валдыры... Пра тое, што крапіва – карысная лекавая расліна, мы даведаліся значна пазней, як і пра літаратурнага цёску «пякучкі». Зразумела, я маю на ўвазе Кандрата Крапіву, вядомага беларускага байкапісца, прадаўжальніка традыцый Эзопа і Крылова.

*Я не пясняр! Я мастак! –*

*Хай так;*
*Мой твор не твор, - дзіця,*
*Мой спеў не спеў, а крык,*
*Але у тон*
*Пад камертон*
*Жыцця*
*Мой зык:*
*Я крыкну – ўраз*
*Па гушчах мас*
*Нясецца хваля рэх*
*І ў свой прабег*
*Раджае смех,*
*Здаровы смех.( К. Крапіва, 1925)*

**2. Пазнавальна-аперацыйны этап.**

**Настаўнік:** А ў вашым разуменні, паважаныя, што такое байка? *( праца з даведачнай і навуковай літаратурай, з артыкулам падручніка на стар.294, тлумачальным слоўнікам. Адказы вучняў )*

Байка – гэта від ліра-драма-эпасу, невялікі, звычайна вершаваны, алегарычны твор павучальнага характару, напісаны вольным ямбам, астрафічным вершам з нерэгулярнай рыфмоўкай (блізкай да размоўнай мовы).

У «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы» падаецца такое тлумачэнне байкі: «кароткі літаратурны твор алегарычнага зместу з павучальнай канцоўкай». У гэтым жанры адчуваецца ўзаемапранікненне ці суседства лірыкі, эпасу і драмы.

**Настаўнік:** Прыгадайце вядомых вам байкапісцаў розных часоў і народаў. (вучні называюць імёны байкапісцаў і змяшчаем партрэты на дошку). Для нашай беларускай нацыянальнай літаратуры такім выдатным байкапісцам стаў К.Крапіва. У адпаведнасці з характарам абранага жанру байкі Кандрат Кандратавіч вырашыў звярнуцца да псеўданіма «Крапіва». Пад абстрэл славутага

сатырыка трапляе ўсё: хібы ў характары чалавека (адпаведна – і ў самім грамадскім жыцці), адмоўныя рысы ў свядомасці людзей, а дакладней: рэлігійныя забабоны, бескультур’е, нахабства, падхалімства, некампетэнтнасць, тупасць, фанабэрыстасць, модніčанне, махлярства, фальш, псеўдавучонасць, грубасць, ганарлівасць, няздольнасць разумна ўспрымаць крытыку.

Галерэя дзеючых асоб у байках Крапівы вялікая і разнастайная. Найбольшае месца ў ёй займаюць свінні. Свіння дык ёсць свіння, ад яе можна чакаць любога свінства. Байкапісец не парушае традыцыйнага ўяўлення пра гэту жывёліну. Разам з тым кожны чарговы раз, робячы яе персанажам твора, надае новыя якасці і рысы. Маўляў, свінства ж шматаблічнае, яно выступае ў розных праявах.

Сатырычныя творы К.Крапівы маюць не толькі беларускае аблічча, яны гучаць на многіх мовах свету, і ў тым ліку на рускай і ўкраінскай, польскай і чэшскай, балгарскай і венгерскай, румынскай і чувашскай, літоўскай і эстонскай, англійскай і нямецкай, французскай і яўрэйскай, асецінскай і грузінскай, армянскай і кіргізскай, таджыкскай і ўзбекскай, кітайскай і мангольскай. У. К. Крапівы – сапраўдны талент бачыць смешнае там, дзе іншыя не бачаць. Без смешнага – няма сатыры. Мэта сатыры, як вызначыў сам Крапіва – выкрыць зло ў імя дабра. Сутнасць сатыры – каб выстаўляць на смех адмоўныя з’явы жыцця.

**Выразнае чытанне байкі «Ганарысты парсюк » (відэа).**

**Настаўнік** Пятрусь Глебка пісаў: «*К.Крапіва валодае шчаслівым і незвычайным талентам: творы яго пакараюць чытача адразу ж, з першага знаёмства з ім, і пакараюць назаўседы…*». І з ім нельга не пагадзіцца.

**Мастацкі аналіз байкі.**

– Ці спадабалася вам байка?

– Хто з’яўляецца яе героямі ?

– Знайдзіце апісанне Парсюка і Падсвінака ў тэксце.

– Што ў паводзінах Парсюка выклівае смех? Чаму так раззлавала яго тактоўная заўвага Падсвінака?
– Як праз лаянку Парсюка выяўляецца яго характар? Якая фраза гучыць асабліва недарэчна?
– Хто маецца на ўвазе пад вобразамі Парсюка і Падсвінка? Якія рысы чалавечага характару байка востра крытыкуе?
– Суаднясіце цэнтральныя вобразы байкі з беларускай народнай прыказкай, узятай эпіграфам да сённяшняга ўрока. Наколькі прыдатнымі будуць тут іншыя народныя выслоўі такія, як:

«*З гразі ды ў князі*»;
«*Качаргой носа не дастанеш*»;
«*У кожнай палашкі свае замашкі*»;
«*Пайшоў у сварку – не шкадуй карку*»;
«*Далікатны як панскі цюцька*»;
«*Хто горды, таму хлеб цвёрды*».

**Настаўнік:** Байка – эпічны жанр, нездарма яе справядліва лічаць сатырычнай камедыяй у мініяцюры. А ў камедыі, як і ў любым драматычным творы, аснова, па словах самога ж Крапівы, – гэта канфлікт. Без яго твор разваліцца. І для байкі як сатырычнай камедыі ў мініяцюры вельмі важна камічная сітуацыя на трывалым падмурку канфлікту, што вырашаецца праз маналогі, а часцей – дыялогі. Камічная сітуацыя – гэта тая, у якой «героі» вымушаны выявіць самыя ганебныя свае якасці, бо там для іх ужо падрыхтавана «пастка», не трапіць у якую можна толькі «апублікаваўшы» ўсе свае «даброты». Кандрат Крапіва – геніяльны майстар і канфліктаў у творах, і камічных сітуацый.

**Байка**

↓

**Экспазіцыя** (зачын)
Выган свіней у поле

**Завязка (**аповед пра падзею **)**

Характарыстыка Парсюка

**Развіццё дзеяння**

**(** дыялог паміж алегарычнымі вобразамі**)**

Размова з Падсвінакам пра брудны лыч

**Кульмінацыя** ( наяўнасць канфлікту )

Парсюк раз'юшан

**Развязка** ( нечаканы вынік дзеяння )

Парсюк грызянуў Падсвінака

**Эпілог** ( мараль-вывад, лагічны вынік, але можа размяшчацца ў пачатку )

Праз вобраз Парсюка паказваецца нахабная сіла тых, хто ваюе супраць праўды пра сябе.

**3. Дыягнастычна-карэкцыйны этап**

**Інсцэніроўка байкі «Ганарысты Парсюк»**

Заданне: сярод прапанаваных літаратуных паняццяў вызначце тыя, якія характэрны для байкі. Абгрунтуйце свой выбар (азначэнні каменціруюцца, дэманструюцца і запісваюцца вучнямі ў сшыткі):

- *алегорыя;*
- *адухаўленне;*
- *іншасказанне;*
- *мараль;*

- *трагедыя;*
- *афарыстычнасць;*
- *драма*
- *структурнасць;*
- *гумар;*
- *сатыра.*

**4. Завяршальны этап.**

**Настаўнік:** Працягніце, калі ласка, сказы:
На ўроку я даведаўся пра …
На ўроку мяне найбольш уразіла…
На ўроку я навучыўся…
Мне хацелася б на наступны ўрок…
- Чаму байкі Кандрата Крапівы актуальна вывучаць сёння? (*меркаванні вучняў)*

**Слова настаўніка:** Байкі Крапівы варта вывучаць сёння, таму што ў яго байках людзі бачаць адлюстраванне сваіх поглядаў, пастаноўку самых хвалюючых, надзённых пытанняў. Цесна звязаная з фальклорам (сюжэты байкапісец чэрпаў са скарбаў народнай творчасці: прыказак, анекдотаў, жартаў), з народным смехам, байка, можа, больш, чым іншыя жанры, вылучаецца сваёй нацыянальнай самабытнасцю. Кожная байка пісьменніка вызначаецца самастойнасцю (непаўторнасцю), мудрасцю, крылатасцю, трапнасцю, яркасцю вобразаў, кампазіцыйнай выразнасцю, гнуткасцю і пластычнасцю, сцісласцю (канспектыўнасцю, эканомнасцю), дакладнасцю і інфарматыўнасцю, багатай сінанімікай, шматзначнасцю слова, з’едлівасцю, вастрынёй, ёмістасцю, асаблівасцямі маралі, добрай прадуманасцю выбару персанажа са свету.

**5. Рэфлексія** ( калектыўная работа, адказы запісваюцца на дошку).

**Настаўнік**: Выступаючы ў абарону жыццядзейнасці байкі, Кандрат Крапіва пісаў: «Часамі можна пачуць гаворку, што байка аджыла свой век. Яна была на часе тады,

калі рызыкоўна было гаварыць у адкрытую аб язвах грамадства, аб заганах і ганебных паводзінах людзей, асадліва тых, якія стаялі на верхніх ступенях лесвіцы. А цяпер жа ў нас у пашане крытыка і самакрытыка. Можна гаварыць без усякіх алегорый, нікога не баючыся. Усякія недахопы ў нашым жыцці і амаральныя паводзіны людзей адкрыта абмяркоўваюцца на ўсіх узроўнях на розных сходах і пасяджэннях. Байцы, як і кожнаму мастацкаму твору, уласціва вобразнае адлюстраванне рэчаіснасці.

Нашто, здавалася б, мастаку пісаць асенні пейзаж. Выехаў за горад або за вясковыя весніцы – і вось ён перад табой. Хто не бачыў у натуры белых бярозак, убраных залацістай лістотай? А тым часам «Залатая восень» Левітана лічыцца шэдэўрам. Вось чаму я думаю, што байка будзе жыць. Абы яна была сапраўдным мастацкім творам. Добрая байка для чытача заўсёды жаданая!»

**Састаўленне сінквейна.**

**Каменціраванае выстаўленне адзнак.**

**Дамашняе заданне: вывучыць байку на памяць.**